УДК 947/987

**В. М. Хаданёнак**

# ПАШТОВА-ТЭЛЕГРАФНАЯ СПРАВА НА НЕАКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*На аснове вялікай колькасці архіўных крыніц аналізуюцца ўмовы жыцця і працы работнікаў пошты і тэлеграфа, разглядаецца працэс перамяшчэння лістоў і пасылак у прыфрантавых губернях. Вылучаюцца праблемы, якія паўсталі перад кіраўніцтвам пошты і тэлеграфа ва ўмовах ваеннага часу. Побач з шырокім выкарыстаннем спецыяльных гістарычных метадаў у даследаванні асаблівая ўвага надаецца апрацоўцы і аналізу шэрага статыстычных даных і звестак. Выкладзены матэрыял будзе карысным пры напісанні абагульняльных прац па гісторыі Беларусі, выкладчыкам вышэйшых навучальных устаноў пры падрыхтоўцы вучэбна-метадычных дапаможнікаў.*

*The process of moving of letters and parcels in the frontline provinces is shown. Along with the wide use of special historical methods in research a special attention is given to the processing and analysis of a number of statistical data and information. The material will be useful for writing general works about the history of Belarus, teachers of higher educational institutions in the preparation of the educational and methodical materials.*

У гады Першай сусветнай вайны паштова-тэлеграфная справа і яе стан сталі адным з важных і прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнага развіцця. Абставіны ваеннага часу вымагалі дасканалай, узгодненай і своечасовай працы работнікаў сувязі. Але ваеннае ліхалецце, недахоп фінансавых сродкаў і службовага персаналу, адсутнасць харчавання і фуражу, уносілі карэктывы ў функцыянаванне паштовай сістэмы.

Шмат хто з работнікаў паштова-тэлеграфнай службы эвакуіраваўся ўглыб Расійскай імперыі, бо не меў сродкаў для існавання. Некаторыя палічылі за лепшае «застацца ў палоне ў Германіі па сваім жаданні...» [1, арк. 86], чым вяртацца на ранейшае месца працы. 12 лютага 1918 г. быў пададзены рапарт начальніку Полацкай паштова-тэлеграфнай канторы ад чыноўніка III разрада І. Баркевіча, у якім зазначалася, што «чыны Полацкага чыгуначнага паштовага аддзялення выехалі ўглыб Расіі, а я, выконваючы абавязак службы, не паспеў з'ехаць, прычым дадаю, што ніякімі відамі грашовага забеспячэння ні за люты, ні за іншыя месяцы не задаволены» [1, арк. 72]. Прыкладна ў такім жа змесце пададзены рапарт ад наглядчыка Варанецкага паштова-тэлеграфнага аддзялення Ф. Ждановіча ад 1 сакавіка 1918 г.: «...начальнік Варанецкага паштова-тэлеграфнага аддзялення выехаў 21 лютага гэтага года і да гэтага часу не вярнуўся. Аддзяленне афіцыйна мне не здаваў. Я, не атрымаўшы забеспячэння за тры месяцы наперад з-за адсутнасці сум у Варанецкім паштова-тэлеграфным аддзяленні, не маю гарантый на будучае атрыманне грошай, не разлічваю на далейшае пражыванне без забеспячэння і эвакуіруюся ўглыб Расіі, каб знайсці сабе пражытак» [1, арк. 86].

Фармальна работнікі пошты атрымоўвалі неблагі заробак. Гэта пацвярджае квітанцыя для «ўтрымання служачых Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі па часовых правілах ад 22 кастрычніка 1916 г.»: чын 1-га разрада 1600 р. + 200 р. кватэрных; чын 3-га разрада: 1050 р. + 140 р. кватэрных; чын 4-га разрада: 900 р. + 150 р. кватэрных; чын 5-га разрада пры казённай кватэры — 600 р.; чын 6-га разрада 450 р. + 120 р. кватэрных; паштальёны, вартаўнікі і рассыльныя: ад 240 да 540 р. + ад 24 да 60 р. кватэрных; малодшы механік — 1 050 р. + 210 р. кватэрных; старшы механік — 2 000 р. + 325 р. кватэрных; начальнік тэлефоннай сеткі 2 400 р. + 400 р. кватэрных [2, арк. 219–219 адв.]. Аднак заработная плата выплачвалася з затрымкамі ў некалькі месяцаў і не ў поўным аб'ёме.

Нягледзячы на адсутнасць рэгулярнага заробку, некаторыя асобы спрабавалі ўладкавацца на працу ў паштова-тэлеграфныя аддзяленні, бо гэта давала ім права атрымаць вызваленне ад прызыву ў дзеючую армію. Скарыстаўшы такую магчымасць і атрымаўшы адтэрміноўку, многія пакідалі свае працоўныя месцы. Лепельскі і Полацкі павятовыя камітэты па справах аб наданні адтэрміновак ваеннаабавязаным былі завалены прашэннямі, згодна з якімі скасоўваліся папярэднія хадайніцтвы аб вызваленні ад ваеннай службы. Найбольш часта яны прыходзілі з Чарсцвянскага і Гарбачова-Аляксандраўскага паштовых аддзяленняў [3, арк. 21–22].

Усё гэта не задавальняла кіраўніцтва краіны. Таму ў працэс мабілізацыі служачых пошты і тэлеграфа былі ўнесены пэўныя змены: адтэрміноўка давалася толькі ў выпадку заключэння новага кантракта на службу на новых умовах; адтэрміноўкі ад прызыву даваліся толькі ямшчыкам, якім было не менш чым 36 гадоў [2, арк. 76 адв.]; адтэрміноўка паштова-тэлеграфным служачым, нарадзіўшымся ў 1898 г., тычылася толькі тых, хто быў прыняты на службу паштова-тэлеграфнага ведамства да 1 лістапада 1916 г. [2, арк. 26]. Пакінуўшыя службу неадкладна прыцягваліся да выканання вайсковай павіннасці.

Паштова-тэлеграфныя станцыі зазналі надзвычай вострую патрэбу ў працоўных руках. Таму была спрошчана нават працэдура прыёму на службу ў дадзеныя ўстановы. Як адзначалася ў цыркуляры МУС Расійскай імперыі ад 2 красавіка 1917 г., «цяпер ніхто не карыстаецца асобымі перавагамі пры паступленні на службу і права гэта ў аднолькавай ступені належыць усім грамадзянам Расійскай дзяржавы, без адрознення нацыянальнасці і веравызнання» [2, арк. 161]. Для паступлення на службу патрабаваліся да-

кументы: фатаграфічная картка; пашпарт; метрычнае пасведчанне; пасведчанне ўрача аб стане здароўя; пасведчанне аб несудзімасці (за выключэннем выпадкаў суда па палітычных справах); пасведчанне аб адукацыі (для кандыдатаў на чыноўніка не павінна было быць меншае за курсы вышэйшага пачатковага вучылішча ці роўнае яму).

Выконваючы ўрадавую пастанову, начальнік Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі даслаў 27 лютага 1917 г. начальнікам паштова-тэлеграфных і паштовых устаноў Смаленскай акругі тэлеграму: «Гаспадзін Смаленскі губернатар прызнаў магчымым дапушчэнне ў раёне Смаленскай губерні асоб іўдзейскага веравызнання да выканання абавязкаў ямшчыкоў, але без права надання адтэрміновак ад прызыву ў войска» [2, арк. 76].

Асоб, прызначаемых на службу паштова-тэлеграфнага ведамства, сталі прыводзіць да прысягі новай формы, зацверджанай Часовым урадам. Былі заменены і бланкі клятвенных абяцанняў. Згодна з цыркулярам ад 26 лютага 1917 г. № 5247 перасталі патрабаваць пасведчанні аб палітычнай добранадзейнасці і аб прыналежнасці да масонскіх лож [2, арк. 84]. З-за катастрафічнага недахопу мужчын на паштовай службе 12 лістапада 1916 г. была прынята пастанова, згодна з якой быў дадзены дазвол на «прыняцце пісьменных жанчын на пасады паштальёнаў на аднолькавых з мужчынамі асновах і з тым, каб яны дапускаліся да ўсіх паштальённых абавязкаў, за выключэннем толькі суправаджэння пошты па трактах» [2, арк. 5]. Жанчын (толькі моцнага фізічнага складу, якія ўмелі кіраваць коньмі і мелі не менш чым 25 год) сталі браць на службу нават у якасці ямшчыкоў [2, арк. 127].

Цяжкае становішча служачых, абумоўленае блізкасцю фронту, разумелі начальнікі паштова-тэлеграфных акруг. Персанал станцый вымушаны быў праводзіць большую частку дня на працы. Таму ўвесь час шукаліся шляхі, каб рабочыя мелі магчымасць «атрымліваць па ўмераных цэнах гарбату, закуску, сняданкі і абеды» [2, арк. 26]. З гэтай мэтай пры ўстановах арганізоўваліся сталовыя. З-за адсутнасці памяшканняў сталовыя часта размяшчаліся ў кватэрах службоўцаў, што знаходзіліся побач з месцам працы. За гэта ім плацілі невялікія грошы. Калі і такіх памяшканняў не хапала, то арандаваліся прыватныя кватэры.

Істотнай дапамогі з боку дзяржавы паштова-тэлеграфныя службы не мелі. На ўласныя патрэбы выкарыстоўваліся самастойна зробленыя грошы. Фонды паштова-тэлеграфных аддзяленняў папаўняліся ад продажу марак, канвертаў, бланкаў. Дадатковыя спагнанні браліся за міжнародныя паштовыя пераводы, накладныя плацяжы, за перасылку перыядычных выданняў. На карысць пошты ішла і палова камісійнага збору ад падпіскі на пачасовыя выданні; збор з праязджаючых на паштовых конях; зборы за міжнародныя пасылкі, выдаваемыя з мытняў і сумы, якія паступаюць па разліках за пакетную і пасылачную карэспандэнцыю [4, арк. 21 адв.]. Невялікую частку прыбытку складалі зборы за перадачу дэпеш; зборы ад эксплуатацыі ўрадавых і прыватных тэлефонных сетак. Ішлі паступленні і ад здачы ў арэнду казённых будынкаў, ад продажу дарожнікаў, тэлеграфных тарыфаў, карт, часопісаў і г. д. [4, арк. 22 адв.]. Грошы прыходзілі ад розных спагнанняў і штрафаў (за парушэнне статутаў, узаконенняў і пастаноў, за таемнае ўкладанне ў лісты і пасылкі і г. д.) [4, арк. 23 адв.]. Невялікія сумы даваў гербавы збор і прабірны збор па смеце Міністэрства гандлю і прамысловасці [4, арк. 24 адв.]. 24 лютага 1917 г. ва ўстановах паштова-тэлеграфнага ведамства была ўведзена новая аперацыя — продаж гульнявых карт і марак ведамства ўстаноў імператрыцы Марыі для аплаты збору з публічных відовішчаў і ўвесяленняў [2, арк. 75 адв.].

Праца паштовых служачых ускладнілася ў гады Першай сусветнай вайны. Акрамя выканання непасрэдных функцыянальных абавязкаў, яны павінны былі пільна адсочваць і не дапускаць перасылкі забароненых рэчываў альбо прадуктаў за мяжу. На гэта існавала цыркулярнае прадпісанне ад 3 жніўня 1915 г. № 32942 (са зменамі і дапаўненнямі ад 2–3 чэрвеня 1916 г. № 16464) [5, арк. 16]. На працягу вайны ў яго ўвесь час уносіліся змены і дапаўненні. Толькі ў дадатковы спіс прадметаў, забароненых да вывазу з Расіі за мяжу па ўсіх межах імперыі трапілі: бавоўняна-папяровыя тканіны; рыба, луска і клей з рыбы; цялячыя страўнікі; паліравальныя і шліфавальныя рэчывы; спіртавыя напоі; какава і шакалад; тканіны, прамочаныя гумай; карбід кальцыю; цэлюлоза і дрэўная маса; раслінны воск; торф і торфабрыкеты; цыянамід; алмазы; дэзінфекуючыя рэчывы; фрукты ўсіх відаў і нарыхтоўкі з іх; фера сіцылій; газы згушчаныя, звадкаваныя і адмысловыя сасуды для іх; газы і вадкасці ўдушлівыя, а таксама прадукты, якія служаць для іх вырабу: бром, хлор, хлорвокіс вугляроду, хлорацэтон, хлорысты мыш'як; тлушчы ўсялякія абмыленыя (мыла) і неабмыленыя; плады маслянічныя; аптычныя прыборы і іх часткі; аптычнае шкло; машыны і інструменты; электрычныя прыборы і іх асобныя часткі; мінеральныя і зямельныя фарбы, у тым ліку сурык жалезны; металоіды; солі і кіслоты ад металаў хрому, марганцу, малібдэну, тытану, вальфраму, ванадыю, медзі, волава, ртуці, нікелю, свінцу і цынку; мінеральныя фасфаты і злучэнні фосфару; солі калію; камедзь; камедзістыя смолы і смала-вар; шоўк натуральны і штучны ў вырабах; руда серы; маса, што атрымоўваецца пры ачысцы газу; маторы, лакамабілі і трактары розных сістэм; экіпажы і іх асобныя часткі; усялякія шаўковыя рэшткі: фрызон, сарнак, худыя і бракаваныя коканы, чхара; бурэтная шаўковая пража, пража бур-дэ-суа ці шапа; шаўковая вата часаная і нечасаная; шаўковае сырцовае рыззё; цукеркі, манпасье і іншыя прадукты перапрацоўкі цукру [2, арк. 17].

Існаваў асобны спіс прадметаў, якія дапускаліся да вывазу ў саюзніцкія краіны: кукуруза; вотруб'е і розныя выжымкі; свініна-бекон; тытунь вышэйшага гатунку (па пасведчанні аб такой яго якасці з боку акцызнага нагляду); лясныя матэрыялы; мех розны (акрамя авечага, барановага і казінага); смала; пянька і пяньковая кудзеля; вінны спірт, спіртавыя напоі; сантанін; спарыння; фрукты ўсялякіх гатункаў і нарыхтоўкі з іх; вярблюджая грыва (загадвалася сачыць,

каб пад выглядам вярблюджай грывы не вывозілася вярблюджая поўсць, якая выкарыстоўвалася для вырабу пражы) і інш. [2, арк. 18].

Нягледзячы на самаахвярную працу часткі паштова-тэлеграфных служачых, работа шэрагу паштовых аддзяленняў выклікала справядлівыя нараканні з боку насельніцтва. З розных гарадоў, вёсак і часцей фронту паступалі скаргі на недастаткова ўважлівыя адносіны з боку паштова-тэлеграфных служачых да патрэб людзей, у прыватнасці на зусім недапушчальную з'яву: знікненне газет, лістоў, тэлеграм і пасылак [2, арк. 280].

З перапіскі з паштовымі аддзяленнямі аб руху карэспандэнцыі можна даведацца аб «масавых недахопах наступнага характару: пераводы пры рэестрах праходзілі без суправаджальных дакументаў; на ярлыках мяшкоў не пазначаліся нумары, і ярлыкі ў большасці не мелі адбітку штэмпеля, месца і часу адпраўлення; простая карэспандэнцыя атрымлівалася звязкамі вагой каля $3^1/_2$ пудоў, без пазначэння на іх месца адпраўкі і прызначэння, прычым карэспандэнцыя заўжды аказвалася несарціраванай; даплатная карэспандэнцыя часта атрымлівалася ў выглядзе простай і сума даплатнага збору выкарыстоўвалася няправільна» [5, арк. 49].

Характэрным у працы служачых пошты было тое, што засылаліся лісты, адрасаваныя ў запасныя вайсковыя часці, аднайменныя з назвамі вайсковых часцей дзеючай арміі (адрозніваліся ад апошніх толькі словам «запасныя»). У выніку гэтага адбывалася масавая засылка лістоў замест адной часці ў другую [1, арк. 19].

У гады вайны частымі сталі выпадкі, калі начальнікі паштова-тэлеграфных аддзяленняў задавольвалі прашэнні службоўцаў аб звальненні іх у водпуск ці адгуле па хваробе, а таксама для суправаджэння хворых членаў сям'і да ўрача. Між тым у дадзеных асоб адсутнічалі медыцынскія пасведчанні, падцвярджаючыя факт хваробы служачага ці члена яго сям'і [2, арк. 141]. Гэтым поўнасцю карысталіся асобныя супрацоўнікі пошты.

Некаторыя прызначаныя на службу паштальёны пад выглядам хваробы адмаўляліся ад выканання сваіх абавязкаў (асабліва ад разноскі карэспандэнцыі, як галіны самай цяжкай, дзе патрабаваліся вынослівасць і добрае здароўе). 30 снежня 1916 г. начальнік Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі зазначаў: «Хаця ад асоб, якія паступаюць на службу ў паштова-тэлеграфнае ведамства, і патрабуюцца медыцынскія пасведчанні, якія яны прад'яўляюць пры сваіх прашэннях, але гэтыя пасведчанні, як я мяркую, атрымліваюцца ад урачоў вельмі свабодна, без папярэдняга дэталёвага медыцынскага агляду. Таму здараюцца такія з'явы, што прынятая на службу асоба значыцца па выдадзеным яму пасведчанні абсалютна здаровай, а па прызначэнні яе да разносу карэспандэнцыі раптам заяўляе, што пакутуе ад рэўматызму ног і ў доказ гэтага прад'яўляе новае медыцынскае пасведчанне ад іншага ўрача» [2, арк. 9]. Калі такія выпадкі пачасціліся, было прынята рашэнне па магчымасці не прымаць на службу асоб са значным маёмасным цэнзам і ўвогуле матэрыяльнымі сродкамі. Бо яны ў пераважнай большасці імкнуліся паступіць на службу з мэтай пазбегнуць прызыву ў войска. Начальнікам устаноў загадвалася кожны раз зносіцца непасрэдна з адпаведнымі паліцэйскімі ўладамі і прасіць іх паведамляць пра ўсе неабходныя звесткі, якія тычыліся асоб, што ўладкоўваліся на працу.

Шмат было хібаў у вядзенні дакументацыі работнікамі паштова-тэлеграфных аддзяленняў. 29 снежня 1916 г. начальнік Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі адзначаў: «Пры рэвізіі ўстаноў мною заўважана, што на некаторых паштова-тэлеграфных станцыях не вядуцца кантрольныя перавадныя журналы для запісу ўваходзячых і выходзячых перавадных дэпеш, а таксама і агульных перавадных кантрольных журналаў» [2, арк. 6]. У некаторых выпадках было немагчыма ўказаць дакладны час падачы тэлеграмы, таму што адбітак штэмпеля на квітанцыі не меў выразнага выгляду, слаба і няпоўна адлюстраваны чысло і месяц падачы тэлеграмы [2, арк. 56].

Некаторыя мясцовыя начальнікі няправільна задавольвалі падначаленых, якія камандзіраваліся на фронт для прызначэння ў палявыя ўстановы, належным ім грашовым забеспячэннем, а таксама не давалі гэтым асобам усіх патрэбных у дадзеных выпадках дакументаў [2, арк. 42].

Журналы некаторых наглядчыкаў станцый увогуле не адпавядалі рэчаіснасці. Часам там было занатавана, што ў адзін і той жа час наглядчык значыўся і дзяжурным пры апараце і на лініі для ліквідацыі пашкоджанняў. Альбо наглядчык у журнале ўказваў, што выехаць на лінію на працягу 4–5 гадзін не мог таму, што не было цягнікоў (не ўказваючы нумары цягнікоў і час следавання), але згодна з даведкамі начальнікаў станцыі цягнікі былі. Такія журналы начальнікі ўстаноў завяралі сваім подпісам, без усялякай праверкі адпаведнасці рэчаіснасці гэтых запісаў. Таксама адсутнічалі распіскі рабочых аб атрыманні грошай, а калі такія існавалі ў наяўнасці, то без указання губерні, павета, воласці і вёскі, адкуль быў наняты рабочы [2, арк. 48].

У некаторых выпадках на паштова-тэлеграфных станцыях мяшкі з простай і заказной карэспандэнцыяй набіваліся так шчыльна, што пры выемцы яе пашкоджваліся пачкі з простымі лістамі [2, арк. 135].

Пэўныя праблемы былі з перавозкай пошты па чыгунцы. Паштовыя цягнікі амаль заўжды спазняліся. Не хапала персаналу для суправаджэння каштоўных грузаў. Таварныя вагоны, агульны кошт паштовага грузу якіх не перавышаў 5 000 р., пасылаліся без суправаджэння чыноў паштова-тэлеграфнага ведамства. Пры наяўнасці каштоўных пасылак агульнай вартасцю больш за 5 000 р. таварныя вагоны накіроўваліся ў суправаджэнні аднаго ці больш паштальёнаў (у залежнасці ад памеру агульнай вартасці грузу) [2, арк. 137]. Час знаходжання ў дарозе паштальёнаў складаў адны суткі, пасля чаго яны замяняліся паштальёнамі з іншых устаноў, Аднак гэтыя патрабаванні часта не выконваліся. Пры суправаджэнні таварных вагонаў паштальёны мусілі размяшчацца альбо на пляцоўцы таго вагона, у якім накіроўваліся пасылкі, альбо на пляцоўцы суседняга таварнага вагона [2, арк. 138], але нават тэхнічна такой магчымасці часта не было.

Паштова-тэлеграфная служба ў гады вайны мусіла працаваць у шчыльным саюзе з усімі міністэрствамі Расійскай імперыі, асабліва з Міністэрствам фінансаў. Пры прыёме адрасуемых за мяжу паштовых адпраўленняў, у якіх аказваліся ўкладзенымі рускія крэдытныя білеты, неабходна было кіравацца цыркулярнымі прадпісаннямі ад 7 студзеня і 21 лютага 1916 г. № 656 і 8742. У іх адзначалася, што ўкладанні азначаных адпраўленняў не могуць перавышаць 500 р., незалежна ад таго, ці гэта рускія крэдытныя рублі прыватных асоб ці крэдытных устаноў; прычым ад адпраўцеля трэба было патрабаваць пасведчанне асобы і асобых заяў аб тым, што грошы перасылаюцца на імя асоб, якія не належаць да падданства варожых Расіі краін. Паштовыя адпраўленні з укладзенымі рускімі крэдытнымі білетамі на суму звыш 500 р. маглі перасылацца за мяжу толькі з асобага ў кожным выпадку дазволу міністра фінансаў [2, арк. 20].

Шчыльна супрацоўнічала пошта з ваеннай разведкай і цэнзурай. Згодна з цыркулярнымі прадпісаннямі ад 23 верасня 1915 г., 29 лістапада 1916 г. і 8 сакавіка 1917 г. № 42681, 36171 і 6193 і цыркулярнай тэлеграмы ад 3 кастрычніка 1915 г. № 45061 не дапускалася ўкладаць у пасылкі, адрасаваныя на імя рускіх ваеннапалонных у непрыяцельскія краіны, розныя пісьмовыя паведамленні (запіскі, лісты, паштовыя карткі) [2, арк. 216]. Пільна прагглядаліся ўсе паштовыя пасылкі, адрасаваныя непрыяцельскім ваеннапалонным, якія знаходзіліся на сельскагаспадарчых і грамадскіх работах [5, арк. 214].

Частымі былі для начальнікаў паштова-тэлеграфных аддзяленняў і наступныя загады ад ваеннага ведамства: «Спыніце прыём радыётэлеграм, якія належаць перадачы праз радыёстанцыю Паўночна-Амерыканскіх Злучаных Штатаў, размешчаную на берагах Атлантычнага акіяна і Мексіканскага заліва, а таксама па прызначэнні — Багамскія астравы. Тэлеграмы з прызначэннем Філіпінскія астравы дапускаюцца толькі на англійскай мове, прычым з поўнымі адрасамі і подпісам» [2, арк. 142].

Цяжкае становішча паштовай справы часта ўскладнялася непаразуменнямі з боку мясцовага насельніцтва. Паведамлялася, што «тэлеграфныя лініі, якія праходзяць праз павятовыя мясцовасці, асабліва па сёлах і вёсках, падвяргаюцца пастаяннаму псаванню, якое робяць маласвядомыя элементы. Да ліку звычайных такіх пашкоджанняў адносяцца: біццё падлеткамі і дзецьмі ізалятараў і накідванне на правады розных прадметаў» [2, арк. 268]. На ліквідацыю наступстваў дадзеных учынкаў выдаткоўваліся пэўныя фінансавыя сродкі. І гэта ў той час, калі на асобных паштова-тэлеграфных станцыях не было грошай, каб набыць паперы [6, арк. 142].

Такім чынам, паштова-тэлеграфная служба ў гады Першай сусветнай вайны сутыкнулася са шматлікімі праблемамі: недахоп грашовых сродкаў; адсутнасць істотнай падтрымкі з боку дзяржавы; недакамплектаванасць кадраў. Усё гэта ўскладнялася блізкасцю фронту і наступствамі ваеннага часу. Нягледзячы на гэта, большая частка службоўцаў паштова-тэлеграфных станцый працягвала выконваць сваю нялёгкую працу.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Занальны дзяржаўны архіў у горадзе Полацку (ЗДАП). Фонд 263. — Воп. 1. — Спр. 20.
2. ЗДАП. Фонд 263. — Воп. 1. — Спр. 1.
3. ЗДАП. Фонд 263. — Воп. 1. — Спр. 3.
4. ЗДАП. Фонд 263. — Воп. 1. — Спр. 6.
5. ЗДАП. Фонд 263. — Воп. 1. — Спр. 4.
6. ЗДАП. Фонд 263. — Воп. 1. — Спр. 14.

06.01.2012